ГЛЯДЗІМ НАЙЛЕПШАЕ... СВАЁ 5

ГРОШЫ ЗАРАБІЦЬ, НА ЖАЛЬ, НЯПРОСТА... 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

16 СНЕЖНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 247 (29869)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У САПРАЎДНАГА СПАРТСМЕНА З СЭРЦА СЦЯГ І ГІМН НЕ ВЫРВЕШ»

За што Прэзідэнт крытыкаваў спартыўных функцыянераў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад «Аб асобных пытаннях развіцця спорту ва ўмовах санкцый». Удзельнікі нарады, як адзначыў сам кіраўнік дзяржавы, людзі, ад якіх залежыць развіццё спорту ў нашай краіне: міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктар Лукашэнка, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Луцкі і намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка.

Фота БелТА.

ЧАГО НЕ ХАПАЕ ДЛЯ ПОСПЕХУ?

«Я часам задаюся пытаннем: а што тут развіваць? Чаго ў нас не хапае, каб нашы каманды, нашы спартсмены выступалі на самым высокім узроўні?» — спытаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што хацеў бы пачуць, чаго бракуе, якіх спартыўных пляцовак, збудаванняў і іншага, каб на Алімпіядзе заваёўваць 20—30 медалёў. Па словах Прэзідэнта, такіх вынікаў калісьці дасягалі, прычым у часы, калі не было ўвогуле ніякіх спартыўных збудаванняў.

«Ідзе чэмпіянат свету, я нешта не заўважыў там нашых футбалістаў... Ці я дрэнна назіраю за чэмпіянатам свету? Я добра назіраю — там іх і блізка няма. Больш за тое, я параўноўваю гульню нашых футбалістаў з тым футболам, які сёння паказваюць там спартсмены, і тым больш яны паказваюць іх у зімовы перыяд часу. І як былому футбалісту, які займаўся футболам, мне проста страшна становіцца. Стан гэтага віду спорту, як і многіх іншых, у жахлівым становішчы», — сказаў Прэзідэнт. — А калісьці, прызначаючы вас *(міністра спорту і турызму Сяргея Кавальчука. — «Зв»).*, я спадзяваўся, што вы як чалавек ваенны, які любіць спорт і разумее яго, павернеце там. Я пра віцэ-прэм'ера не кажу... Ну і дзе вынікі?» — паставіў пытанні Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

КАРОТКА

- Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 75-годдзем Рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства «Веды».
- **У Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі традыцыйным націсканнем чырвонай кнопкі ў Беларусі дадзены старт акцыі «Нашы дзеці». Акцыя працягнецца з 15 снежня да 15 студзеня.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«Сістэмная работа па ўключэнні малога і сярэдняга бізнесу ў імпартазамяшчэнне выбудавана і вядзецца сёння з выкарыстаннем трох механізмаў. Першы механізм — фінансавая падтрымка імпартазамяшчальных праектаў. Шырокую лінейку даступных прадуктаў прапануе банкаўская сістэма краіны. Выгадныя пазыкі для мікра- і малых прадпрыемстваў выдае Беларускі фонд фінансавай падтрымкі прадпрымальніцтва. Ужо адабрана 30 праектаў на Br3,6 млрд. Другі механізм — гэта выбудоўванне камунікацыі паміж дзяржаўнымі арганізацыямі і прыватным вытворчым бізнесам. Такую задачу паставіў перад намі кіраўнік дзяржавы на Усебеларускім народным сходзе. І трэці механізм паспяховага імпартазамяшчэння — гэта электронныя гандлёвыя пляцоўкі. Высокая рэзультатыўнасць усіх названых механізмаў дасць магчымасць значна паскорыць укараненне айчынных аналагаў замежных камплектуючых, павысіць ступень лакалізацыі беларускіх тавараў і стымуляваць стварэнне новых імпартазамяшчальных вытворчасцяў».

Нашы людзі

ЗАСТАВАЦЦА МАЛАДЫМ У 70?

Валанцёры «сярэбранага ўзросту» сцвярджаюць, што гэта магчыма

Мы прызвычаіліся, што валанцёрамі становяцца пераважна маладыя людзі. Статыстыка пацвярджае — у сярэднім добраахвотнікам 24 гады. Але ёсць пажылыя людзі, якія разбіваюць гэтыя стэрэатыпы. Валанцёры ў шаноўным узросце дапамагаюць адзінокім старым і інвалідам, навучаюць равеснікаў камп'ютарнай грамаце і фінансавай бяспецы, спяваюць, танцуюць, ладзяць канцэрты і такім чынам даказваюць, што і ва ўзросце за 70 можна заставацца актыўнымі. Месцаў, дзе можна быць карыснымі і дзе вашу ініцыятыву падтрымаюць, таксама багата. Гэта тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, царкоўныя прыходы, прадстаўніцтвы Чырвонага Крыжа...

СТАР. 3

Напярэдадні

«ПАЦЕРКІ ПАВЕСІЛІ, СТАЛІ Ў КАРАГОД...»

Удакладнілі, дзе весела і з карысцю сустрэць Новы год

Ёсць жа на свеце шчасліўчыкі, якія ўмеюць усё планаваць загадзя! І іх нямала. Такія людзі бяруць туры на будучы адпачынак яшчэ зімой, атрымліваючы бонусы і зніжкі. І ўжо ў кастрычніку ведаюць, дзе і як будуць сустракаць Новы год. Калі вы не належыце да іх ліку, значыць, задумаліся аб навагодняй ночы толькі цяпер, калі свята бліжэй і бліжэй, а дзе і як яго правесці — для вас усё яшчэ вялікае пытанне.

У Новы год хочацца яркіх уражанняў, весялосці і пазітыву. Вядома, Трус — самы сямейны звярок Усходняга гараскопа, і менавіта гэты год астролагі раяць сустракаць дома, сярод сваіх. Але ж калі стары добры сцэнарый «аліўе і тэлевізар» сёлета вас не задавальняе, мы вырашылі ўдакладніць, якія рашэнні яшчэ засталіся для тых, хто спахапіўся толькі цяпер. І якія магчымасці вы страцілі — каб у наступным годзе быў стымул задумацца аб навагодняй ночы крыху раней.

СТАР. 4

Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

ISSN 1990 — 763X

«У САПРАЎДНАГА СПАРТСМЕНА З СЭРЦА СЦЯГ І ГІМН НЕ ВЫРВЕШ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У працяг футбольнай тэмы кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на выступленне футбольнай каманды «Дынама-Мінск». Ён задаў пытанне, якія медалі гэты клуб узяў у чэмпіянаце Беларусі. «Ніякія — драўляныя. Дык драўляныя я вам намалюю без грошай. А вы адказваеце за гэтую каманду, я вам даручыў — «займіцеся» і я вам даў грошы», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

ТАМ, ДЗЕ НАЙБОЛЬШ УВАГІ, — НАЙГОРШЫЯ ВЫНІКІ

Па словах Прэзідэнта, санкцыі, якім сёння падвяргаецца айчынны спорт, не павінны быць перашкодай для дэманстрацыі высокіх вынікаў. Ён упэўнены, што ў спорце чым мацнейшы ціск, тым большай павінна быць аддача. «Калі людзі бачаць, што несправядліва іх караюць, яны імкнуцца і паказваюць яшчэ большы вынік. У нас гэта ёсць? У нас гэтага няма. Гэта значыць, там, дзе мы ўдзяляем больш увагі, таму віду спорту — там найгоршыя вынікі. Як так? Хацелася б пачуць тлумачэнні», — заявіў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што хутка ў Беларусі з'явіцца нацыянальны футбольны стадыён. «Хто там будзе гуляць?» — задаў ён лагічнае пытанне. Прэзідэнт запатрабаваў даць адказы на комплекс пытанняў, якія стаяць перад айчынным спортам. Таму што ён звязаны з іншым пытаннем — зарплатамі і заахвочваннямі для спартсменаў. Адпаведны праект указа таксама стаў адной з тэм даклада.

«Слухайце, трэба таемна ў кутку цёмным праводзіць падобныя нарады, каб людзі не пачулі. Таму што яны не толькі вам (вам ёсць за што), але і мне галаву здымуць. Яны спытаюць: за што ім грошы плаціш — яны ж пешшу ходзяць на пляцоўцы ў футболе, хакеі ці ў канькох, у канькабежным спорце, шорт-трэку. Яны не толькі пешшу ходзяць — кульгаюць там», — іранічна заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

І гэта прытым, што кожнаму юнаму спартсмену з дзяцінства даецца магчымасць падняцца, вызначыць здольнасці. «Мастацкая, спартыўная гімнастыка, лёгкая атлетыка — калі ласка, вызначайцеся. Трэнеры ўбачылі, узялі на заметку кагосьці, ідзе развіццё. Што яшчэ патрэбна? Трэба заплаціць за добрыя высокія вынікі. Калі ласка. Колькі? Спачатку дайце гэтыя вынікі», — адзначыў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што хацеў бы пачуць урадавую канцэпцыю стымулявання заработных плат і «іншых пернікаў за дасягненне адпаведных вынікаў».

«ТРЭБА РЫХТАВАЦЦА»

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў 2023 годзе Беларусь прыме II Гульні краін СНД. Ён падкрэсліў, што для кіраўніцтва спартыўнай галіны гэта вельмі сур'ёзны крытэрый. Таксама Аляксандр Лукашэнка праанансаваў кадравую перастаноўку ў пачатку года. «Калі вы яшчэ праваліце Гульні, то я вам скажу адкрыта: тады вам у спорце рабіць няма чаго», — папярэдзіў ён.

Прэзідэнт удакладніў, ці дапушчаны беларускія і расійскія спартсмены да ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях. У некаторых сродках масавай інфармацыі ўжо з'яўляецца такая інфармацыя. Але, як далажылі Прэзідэнту, канчатковае рашэнне яшчэ не прынята.

«Гэта таксама ваша пытанне. Трэба рыхтавацца. Калі вы кажаце аб тым, што трэба спартсменаў падтрымліваць, я згодзен, але толькі тых, хто паказвае вынікі сусветнага ўзроўню», — сказаў Прэзідэнт. Ён канстатаваў, што высокі сусветны ўзровень, вынік на ўзроўні першага, другога і трэцяга месцаў павінны быць крытэрыем для адпаведных ільгот, датацый і іншых заахвочванняў.

У сваім дакладзе міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук заўважыў, што цяпер не санкцыі, напэўна, вызначаюць развіццё нашага спорту ў Беларусі. «Санкцыі вызначаюць толькі ў лепшы бок. Ціск на спартсмена — ён паказвае лепшы вынік, калі ў яго ёсць характар. Мы з вамі былі спартсменамі. Мы гэта цудоўна ведаем і разумеем», — заявіў Прэзідэнт.

Міністр спорту і турызму адзначыў, што цяпер у шасці відах спорту беларускія спартсмены могуць удзельнічаць у міжнародных спаборніцтвах, але без нацыянальнай сімволікі. Гэта тэніс, футбол, шашкі, шахматы, самба і бокс. «Тое, што без сімволікі, — дрэнна... Але гэта не катастрофа. У сапраўднага спартсмена (не тых, якія ў вас збеглі, — няхай бягуць: яны як тут бегалі, так і там бегаюць) з сэрца сцяг і гімн не вырвеш. У сэрцы павінна быць, калі гэта сапраўдны спарстмен. Калі ён бегае, скача і гуляе, то павінен разумець, што ён гуляе перш за ўсё для людзей, не для сябе, для людзей, для сваёй сям'і, прыклад для дзяцей, а потым ужо заробак і іншае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Як адзначыў міністр спорту і турызму, вынікі ў збеглых спарстменаў не растуць.

«Яны ніколі не пакажуць вынік, яны там людзі другога сорту», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Сяргей Кавальчук дадаў, што ад некаторых збеглых трэнераў ужо паступаюць сігналы пра тое, каб вярнуцца.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

СПАБОРНІЦКАЙ ПРАКТЫКІ ХАПАЕ

Размова з Прэзідэнтам аб развіцці спорту вялася ў крытычным рэчышчы. І, як адзначыў **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК** у размове з журналістамі, крытыка з боку кіраўніка дзяржавы была абсалютна справядлівай. «У некаторых відах спорту мы назіраем прасяданні. У футболе сезон мінуў, а вынікаў не паказалі ні зборная, ні клубы. Зноў жа ёсць віды спорту, якія дастойна прадстаўляюць нашу краіну на рознага кшталту спаборніцтвах», — адзначыў ён.

Міністр расказаў, што сёння перад спартыўнай галіной стаіць комплекс задач. Адна з галоўных — зрабіць так, каб у санкцыйны перыяд у спартсменаў не «праселі» вынікі, каб была спаборніцкая практыка, што забяспечыць дастатковая колькасць спаборніцтваў. Стаіць задача арганізаваць работу так, каб было відаць рэзерв і кваліфікацыю трэнерскага саставу. Усе гэтыя тэмы ўзніраліся падчас даклада ў Прэзідэнта. Па словах Сяргея Кавальчука, кіраўнік дзяржавы даў указанні па развіцці асноўных напрамкаў. У першую чаргу — па сумесных дзеяннях з Расійскай Федэрацыяй. Таксама былі дадзены даручэнні па загрузцы спартыўных аб'ектаў, па правядзенні на высокім арганізацыйным узроўні спаборніцтваў, у тым ліку другіх Гульняў краін СНД, па падрыхтоўцы трэнерскіх кадраў і іншых пытаннях, якія датычацца развіцця фізічнай культуры і спорту.

Адной з тэм даклада ў Прэзідэнта быў праект указа «Аб мерах па стымуляванні дасягнення высокіх спартыўных вынікаў». Сяргей Кавальчук расказаў, што праект указа падтрыманы. Але кіраўнік дзяржавы ўсім адказным за спорт паставіў задачу сачыць за вынікамі выступлення спартсменаў на спаборніцтвах. Праектам указа прадугледжваецца, што вынікі выступлення на спаборніцтвах у Расійскай Федэрацыі прыраўнаваны да вынікаў на вядучых спаборніцтвах. «Напрыклад, Анастасія Маслава ў бягучым сезоне кінула молат на 74 метры, гэта ўзровень чэмпіёна Еўропы, значыць, яна павінна атрымаць адпаведную ўзнагароду па ўзроўні чэмпіянату Еўропы. Калі Таццяна Халадовіч кінула кап'ё на 66 метраў — гэта ўзровень сярэбранага прызёра чэмпіянату Еўропы, то і ўзнагарода павінна быць такой», — растлумачыў міністр. Ён звярнуў увагу, што рашэнні па заахвочванні спартсменаў будуць прымацца камісійна, каб і трэнеры, і спарстмены — ніхто не быў пакрыўджаны і ўсе атрымалі дастойную ўзнагароду ў адпаведнасці з вынікамі.

Падчас даклада Прэзідэнт праанансаваў кадравую перастаноўку ў пачатку года. Міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук растлумачыў журналістам, што меліся на ўвазе перастаноўкі ў трэнерскім складзе, у федэрацыях, якія праводзяцца пастаянна і сістэмна. «Тыя віды спорту, дзе не наладжана належным чынам работа, дзе няма выніку, трэба падганяць і ў тым ліку вырашэннем кадравых пытанняў», — заўважыў Сяргей Кавальчук.

Вяртаючыся да тэмы санкцый, міністр спорту адзначыў, што сёння спартсменам хапае спаборніцкай практыкі. У многіх відах спорту канкурэнцыя са спартсменамі Расійскай Федэрацыі нашмат вышэйшая, чым на еўрапейскай арэне. «Наша задача — трэніравацца і быць гатовымі ў любы момант на любых спаборніцтвах дастойна выступаць і высока паднімаць сцяг нашай краіны», — сказаў Сяргей Кавальчук.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Reuters: краіны Еўрасаюза не змаглі дамовіцца наконт дзявятага пакета санкцый супраць РФ

Краіны — члены Еўрасаюза не змаглі дамовіцца наконт дзявятага пакета санкцый супраць Расіі. Аб гэтым паведамляе агенцтва Reuters са спасылкай на крыніцы сярод дыпламатаў.

«Краіны наблізіліся да пагаднення на перагаворах у сераду, але ў Польшчы і некаторых іншых краінах усё яшчэ ёсць пярэчанні», — падзяліўся адзін з дыпламатаў.

Па інфармацыі агенцтва, галоўныя рознагалоссі заключаюцца ў пытанні, ці павінен ЕС спрасціць імпарт расійскіх угнаенняў праз еўрапейскія парты нават у выпадку, калі кампаніі — вытворцы ўгнаенняў належаць алігархам з чорнага спісу.

Паведамляецца, некаторыя мяркуюць, што абмежаванні ЕС уяўляюць пагрозу харчовай бяспецы краін, якія развіваюцца, у той час як іншыя сцвярджаюць, што іх паслабленне дазволіць расійскім алігархам, якія валодаюць прадпрыемствамі па вытворчасці ўгнаенняў, пазбегнуць санкцый ЕС супраць іх.

У Новай Зеландыі назаўжды забаранілі продаж тытуню ўсім, хто нарадзіўся пасля 2008 года. Такі закон прыняты ўпершыню ў свеце

Парламент Новай Зеландыі ўчора прыняў закон аб пажыццёвай забароне продажу тытунёвых вырабаў усім, хто нарадзіўся пасля 2008 года і народзіцца ў будучыні, паведамляе Time. Гэта першы такі закон у сусветнай практыцы.

Новая Зеландыя паставіла сабе за мэту да 2025 года стаць краінай, свабоднай ад курэння. Прыняты закон таксама зніжае колькасць пунктаў продажу цыгарэт з 6000 да 600 па ўсёй краіне і абавязвае знізіць канцэнтрацыю нікаціну.

«Няма добрых прычын дазваляць продаж прадукту, які забівае палову людзей, што яго выкарыстоўваюць», — адзначыла ў парламенце міністр аховы здароўя Айша Верал. Яна дадала, што забарона ў перспектыве захавае тысячы жыццяў і сэканоміць казне мільярды долараў, якія трацяцца на лячэнне хвароб, звязаных з курэннем: раку, інфарктаў і інсультаў, ампутацый.

Зрэшты, парламенцкая апазіцыя закон раскрытыкавала. На іх думку, яго ўвядзенне прымусіць закрыцца шмат маленькіх прыватных крам, работа якіх без продажу цыгарэт стане нявыгаднай. А таксама закон можа прывесці да ўзнікнення вялікага чорнага рынку тытуню.

Паводле апошніх звестак, сёння штодня курыць 8 % новазеландцаў — гэта ўдвая менш, чым дзесяць гадоў таму.

Вучоныя высветлілі, што трывалая сувязь з суседзямі памяншае рызыку смяротнасці адзінокіх старых

Даследчыкі з Ратгерскага ўніверсітэта высветлілі, што блізкія адносіны з суседзямі зніжаюць рызыку смяротнасці для адзінокіх пажылых людзей. Вынікі працы былі апублікаваны ў часопісе Social Science and Medicine.

Жыццё ў адзіноце звязана з рознымі неспрыяльнымі наступствамі для здароўя, такімі як дэпрэсія, сардэчна-сасудзістыя праблемы, старэчая прыдуркаватасць і заўчасная смерць. Таму даследчыкі паспрабавалі вызначыць, якія фактары могуць змякчыць негатыўныя наступствы жыцця ў адзіноце.

У рабоце каманда прааналізавала дадзеныя даследавання насельніцтва пажылых амерыканцаў, у тым ліку інфармацыю аб адносінах з навакольнымі і стане здароўя. Даследаванне праводзілася з 2011 па 2013 год. Статус смяротнасці адсочваўся да снежня 2021 года. Усяго даследчыкі прааналізавалі звесткі больш як аб трох тысячах добраахвотнікаў.

Вучоныя выявілі, што ва ўдзельнікаў, якія жылі ў адзіноце і якія паведамілі аб нізкім узроўні ўзаемадзеяння з суседзямі, рызыка смерці была на 48 % вышэйшая, чым у іх аднагодкаў, якія сябравалі з суседзямі.

Блізкая ўлада

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 17 снежня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый Вітольдавіч ШУЛЕЙКА. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анжаліка Аляксандраўна НІКІЦІНА. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Вадзімавіч АЛЕЙНІКАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Іван Іванавіч КУРМАН. Тэл. 8 015 273 56 44;

• старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Міхайлавіч ІСАЧАНКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Ігар ЛУЦКІ:

«Інфармацыйная вайна папярэднічае гарачай фазе супрацьстаяння»

На тэрыторыі Савецкага раёна сталіцы, дзе знаходзіцца вялікая колькасць навучальных устаноў, у тым ліку ВНУ, і жыве каля 12 тысяч маладых людзей, прайшла сустрэча намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігара ЛУЦКАГА з ідэалагічным актывам. Мерапрыемства было прысвечана актуальнай сёння тэматыцы — інфармацыйнай бяспецы. Інфармацыйныя пагрозы, развіццё тэхналогій, інфармацыйная палітыка — пра гэта і іншае ішла гаворка з кіраўнікамі прадпрыемстваў і рэктарамі ВНУ. Ігар Луцкі падкрэсліў, што ідэалагічны актыў мусіць быць гатовы да любых інфармацыйных атак і іх адбіцця. Прычым важна не «сядзець у абароне», а весці наступальную інфармацыйную работу.

— Сучасны малады чалавек атрымлівае шмат інфармацыі, спектр яе шырокі, у тым ліку на псіхіку ўздзейнічаюць фэйкі і ўкіды. Як правіла, маладыя людзі адразу прымаюць рашэнні, не ўдумваючыся і не аналізуючы, не пацвярджаючы тую ці іншую інфармацыю з розных крыніц, — сказаў Ігар Луцкі, адзначыўшы, што менавіта моладзь сёння самая ўразлівая катэгорыя ў плане інфармацыйнага ўздзеяння.

Ужо нікога не здзіўляе выкарыстанне разнастойных метадаў маніпулявання грамадскай думкай. Распаўсюджваецца практыка мэтанакіраванага інфармацыйнага ціску, які наносіць істотную шкоду нацыянальным інтарэсам.

— Кіраўнік дзяржавы справядліва адзначыў, што нашы каштоўнасці не ўпісваюцца ў сістэму глабалісцкага светаўпарадкавання, бо супярэчаць каштоўнасцям тых, хто ў гэтай сістэме мае намер дамінаваць. Мы падвяргаемся інфармацыйнаму ўздзеянню не таму, што з'яўляемся карыстальнікамі інфармацыі, а таму, што нашы апаненты імкнуцца разбурыць наш духоўны пачатак, нашы традыцыі, прынцыпы, каштоўнасці. Гарачая вайна сёння ідзе на адлегласці ўсяго 300 кіламетраў ад нас, а гібрыдную вайну, яе інфармацыйную частку, мы ўсе на сабе адчуваем, — падкрэсліў Ігар Луцкі.

Як вядома, інфармацыйныя войны — не вынаходніцтва сённяшняга дня. Яшчэ ва ўмовах халоднай вайны ўрады многіх краін намагаліся ўплываць на нашу тэрыторыю. Але калі ў той час можна было дакладна кантраляваць сваё інфармацыйнае поле, то пачынаючы з 1990-х гадоў сітуацыя істотна змянілася.

— Сёння амаль сцёрты дзяржаўныя граніцы ў плане распаўсюджвання інфармацыі, 2/3 насельніцтва планеты «накрыта» адзіным інфармацыйным полем. Адбываецца штогадовы прырост карыстальнікаў, якія спажываюць гэтую інфармацыю, — распавёў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Такое шырокае распаўсюджанне інфармацыйных тэхналогій прывяло да таго, што сучасныя канфлікты, якія адбываюцца на тэрыторыі розных дзяржаў, цяпер спалучаюць розныя віды супрацьборстваў і валодаюць камбінаваным уздзеяннем на насельніцтва. Інфармацыйна-тэхналагічнае ўздзеянне — адно з такіх.

— Можна не заходзіць на тэрыторыю іншай дзяржавы, а здалёк змяняць грамадска-палітычную абстаноўку ў любой з краін. Гэта і называецца інфармацыйнай вайной. А яна практычна папярэднічае ваеннаму супрацьстаянню. Мы бачым на прыкладзе Украіны, і гэта амаль класічная схема. На працягу васьмі гадоў ішла дэтальная інфармацыйная апрацоўка насельніцтва, разбураліся нашы славянскія каштоўнасці. Сёння мы бачым вынік такога інфармацыйнага ўздзеяння, — падкрэсліў Ігар Луцкі.

Ён дадаў, што сама па сабе інфармацыйная бяспека — не толькі элемент інфармацыйна-псіхалагічнага ўздзеяння. Яна распаўсюджваецца і на эканамічныя інтарэсы. Гаворка ідзе пра кіберпагрозы і кібератакі на інфраструктуру нашай дзяржавы ў тым ліку.

Ігар Луцкі нагадаў, і якім быў уплыў на наша насельніцтва да 2020 года, калі ў краіне працавалі шматлікія апазіцыйна заходнімі дзяржавамі СМІ. Але краіна выстаяла. Цяпер у нас з'явілася новая форма журналістыкі — аўтарская. І дзяржаўныя СМІ дапамагаюць супрацьстаяць у нябачнай інфармацыйнай вайне. А вось у сучасных сродках камунікацыі — сацсетках, тэлеграм-каналах — работы яшчэ дастаткова, адзначыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Алена КРАВЕЦ.

Шчырая размова

ЦІ ЛЁГКА БЫЦЬ ГУБЕРНАТАРАМ?

Фота БелТА.

У рамках злёту маладых спецыялістаў, які адбыўся ўчора ў Магілёве, прайшоў адкрыты дыялог са старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Анатолем ІСАЧАНКАМ.

«Як ваш настрой, хацеў бы пачуць прапановы, пажаданні, што падабаецца, што — не?» — кіраўнік рэгіёна звярнуўся да маладых з просьбай быць як мага больш адкрытымі. На сустрэчы прысутнічалі 50 спецыялістаў, якія працуюць у розных раёнах вобласці і розных галінах народнай гаспадаркі. Работа с моладдзю ў вобласці вядзецца шматгранная. А падобныя камерныя сустрэчы дапамагаюць намацаць болевыя пункты, лічыць губернатар. За дзве гадзіны прагучала шмат пытанняў непасрэдна з залы, але спачатку былі агучаны тыя, што паступілі ў анлайн-прыёмную.

Моладзь цікавіў асабісты вопыт губернатара: што, напрыклад, патрэбна, каб стаць кіраўніком, з чаго складаецца рабочы дзень старшыні аблвыканкама? Другую групу склалі пытанні, як той казаў, ад жыцця. Нехта не стольі пытаўся, колькі дзяліўся ўражаннямі ад сваёй работы і адносінамі з боку кіраўніцтва. Трэці блок склала тэма патрыятызму. Прычым апошняя аказалася найбольш эмацыянальнай.

Анатоль Ісачанка адкрыта дзяліўся сваімі думкамі і вопытам, даваў парады. Тым, каго цікавіла, як даслужыцца да пасады кіраўніка вобласці, адказаў: «Трэба шмат вучыцца, працаваць, прайсці ўсе прыступкі». І прапанаваў ахвотным правесці адзін дзень побач з ім, каб самім ацаніць, наколькі складана ўзначальваць абласную «вертыкаль».

«Запомнілася гутарка з маладымі спецыялістамі, — расказаў Анатоль Ісачанка. — Ім прапанавалі работу ў сельскай мясцовасці, а яны адмовіліся, маўляў, далёка ехаць. Але калі ты хочаш расці прафесійна, трэба рухацца».

У вобласці сёлета прыйшло працаваць больш чым 3,5 тысячы маладых спецыялістаў. Як іх падтрымаць, дапамагчы стаць на крыло? Малады намеснік дырэктара школы з Глуска паведаміў, што асабіста яму даў пазітыўны штуршок турзлёт: «Сам я з Быхава, а ў Глуску знайшоў аднадумцаў дзякуючы той сустрэчы».

Валерыя нарадзілася ў Магілёве, але вырашыла застацца ў Краснаполлі: «Людзі там іншыя. Больш шчырыя». Дзяўчыне далі арэнднае жыллё, а працуе яна ў Доме рамёстваў ганчаром-керамістам.

Адна з формаў зносін — форумы, дзе можна даведацца, якія ёсць прадпрыемствы, турыстычныя аб'екты. Дзяўчына, што працуе на «Ліфтмашы», расказала, як яе ўразіла паездка ў Бабруйск, дзе яны наведалі «Белшыну», гістарычныя аб'екты.

Анатоль Ісачанка звярнуў увагу на важнасць настаўніцтва на першым рабочым месцы. Сам ён дагэтуль помніць свайго настаўніка, які прыйшоў працаваць у калгас «Савецкая Беларусь» у Горацкім раёне.

Што неабходна, каб моладзь замацоўвалася на першым рабочым месцы? Напрыклад, Максім, які працуе на прадпрыемстве цеплаэнергетыкі, паведаміў, што застаўся дзякуючы футболу, бо трапіў у вельмі добрую каманду, якую складаюць яго калегі.

Маркетолаг Арцём выказаў меркаванне, што паўплываць на рашэнне застацца можа, напрыклад, грамадская ініцыятыва. Так, жыхароў аграгарадка Цішоўка Магілёўскага раёна аб'яднала будаўніцтва гульнявой пляцоўкі.

— Сустрэча прайшла пазітыўна, абмеркавалі шмат тэм, — рэзюмаваў Анатоль Ісачанка. — Усё было адкрыта і шчыра. Такія гутаркі павінны праводзіцца рэгулярна.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ЗАСТАВАЦЦА МАЛАДЫМ У 70?

ДАПАМОГА І НАВУЧАННЕ РАВЕСНІКАЎ

— Значнасць валанцёрскай дзейнасці людзей «сярэбранага ўзросту» і неабходнасць яе развіцця адзначаны ў Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце — 2030» як адна з задач уцягвання пажылых у жыццё грамадства, — адзначае **кансультант упраўлення сацыяльнай падтрымкі, апекі і папячыцельства Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вольга ДУБОВІК**.

У 146 тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і 92 дамах-інтэрнатах па ўсёй краіне працуюць «сярэбраныя» валанцёры. Іх больш за тры тысячы.

— Гэта людзі, якія выйшлі на пенсію і маюць сваю актыўную жыццёвую пазіцыю, гатовы бескарысліва дапамагаць людзям, навучаць іх. Пры іх дапамозе рэалізуецца вялікая колькасць ініцыятыў пры тэрытарыяльных цэнтрах і дамах-інтэрнатах, — расказвае Вольга Дубовік.

Найперш гэта клопат і падтрымка адзінокіх пажылых і людзей з інваліднасцю. Дзейнічае «Цэнтр валанцёрскай дапамогі», дзе існуюць такія паслугі, як памочнік на гадзіну, валанцёр-сувязны, а таксама школы догляду і клопату. У школах бяспекі, камп'ютарнай пісьменнасці, на моўных і курсах па фінансава-эканамічнай бяспецы валанцёры «сярэбранага ўзросту» працуюць па прынцыпе «роўны навучае роўнага».

Яшчэ адзін важны кірунак дзейнасці — наведванне дома адзінокіх пажылых людзей для псіхалагічнай падтрымкі. Асабліва актуальным гэта стала падчас пандэміі COVID-19, калі людзі засталіся адны. Тады атрымала развіццё анлайн-падтрымка, а ў рэалізацыі ініцыятывы для людзей старэйшага ўзросту #яанлайн дапамаглі Чырвоны Крыж і кампанія А1.

Валанцёры «сярэбранага ўзросту» актыўныя і ў захаванні гістарычнай памяці: яны даглядаюць магілы ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, дапамагаюць аднаўляць пахаванні.

І работа, і баўленне вольнага часу адначасова — арганізацыя клубаў па інтарэсах, дзе пажылыя людзі знаходзяць сябе ў мастацкай самадзейнасці і іншых відах творчасці. Валанцёры танцуюць, спяваюць, ладзяць дабрачынныя мерапрыемствы, святочныя канцэрты і спектаклі не толькі ў сваіх установах, але і ў дзіцячых дамах, цэнтрах карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі, дамах-інтэрнатах.

— Самым вялікім попытам у нашых пажылых людзей карыстаюцца гурткі і клубы па інтарэсах, творчая дзейнасць, — адзначае Вольга Дубовік. — Ёсць выдатныя прыклады, калі людзі ствараюць музеі пры сваіх дамах, праводзяць экскурсіі. Адзін з новых цікавых кірункаў — цэнтры патрыятычнага выхавання, дзе нашы пажылыя людзі дзеляцца з моладдзю сваімі ведамі і досведам.

ШТО ПРАПАНУЕ ЧЫРВОНЫ КРЫЖ?

У Беларускім Чырвоным Крыжы працуе 16 тысяч валанцёраў — як моладзь, так і пенсіянеры. Людзі старэйшага ўзросту ўдзельнічаюць у медыка-сацыяльнай праграме «Дапамога», падтрымліваюць адзінокіх і пажылых людзей, якія жывуць адны. Акрамя таго, удзельнічаюць у ліквідацыі надзвычайных сітуацый, аказваюць псіхасацыяльную падтрымку хворым на сухоты і тым, хто жыве з ВІЧ, кансультуюць на інфармацыйнай лініі таварыства 201, распаўсюджваюць веды аб міжнародным гуманітарным праве, кансультуюць людзей па пытаннях вакцынацыі і ўдзельнічаюць у іншых валанцёрскіх ініцыятывах. Усяго ў краіне больш за тысячу валанцёрскіх груп, якія дапамагаюць спраўляцца з рознымі выклікамі.

— Нашы валанцёры самі вырашаюць, колькі часу могуць патраціць на сваю дабрачынную дзейнасць. Мы клапоцімся аб іх эмацыянальным стане і фізічным здароўі, і валанцёры, якія схільныя да рызык, — тыя, хто працуе ў медыка-сацыяльнай службе, па надзвычайных сітуацыях, — застрахаваны, — распавядае **спецыяліст па рабоце з валанцёрамі Беларускага Чырвонага Крыжа Марына ТРАБУХІНА**.

СЛУЖЭННЕ ПРЫ ЦАРКВЕ

Заўсёды рады бачыць валанцёраў і ў Беларускай праваслаўнай царкве, дзе таксама рэалізуецца нямала праектаў. Перад тым як працаваць, валанцёрам перадаюць адмысловыя навыкі. Адзін з такіх праектаў — «Летняя школа жэставай мовы», якая сёлета праходзіла другі раз.

— Валанцёры брацтва Іаана Багаслова пры Свята-Духавым кафедральным саборы і храма ў гонар Святога Уладзіміра Хіраска прымалі ўдзел у рабоце школы жэставай мовы, каб потым працаваць з глухімі і людзьмі з аслабленым слыхам, — расказвае **намеснік старшыні сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы Алег ЛЕПЕШАНКОЎ**.

Акрамя таго, валанцёры могуць дапамагаць анкапацыентам, працуюць у хоспісах, дзіцячых установах.

— Мы часта ў нашай дзейнасці сутыкаемся са смерцю, цяжкімі хваробамі, і наша задача — падтрымаць людзей, якія прыходзяць з запалам, якія нам давяраюць і хочуць дапамагаць, — кажа **каардынатар добраахвотніцкага руху храма іконы Божай Маці «Усецарыца» Ірына БАБІЧ**. — Гэта школы, трэнінгі, псіхалагічная падтрымка. Акрамя таго, пры храмах можна звярнуцца і атрымаць дапамогу ў духоўнікаў і свяшчэннікаў.

НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Работа валанцёраў «сярэбранага ўзросту» падтрымліваецца мясцовымі ўладамі. У кастрычніку–лістападзе праходзілі абласныя мерапрыемствы па заахвочванні валанцёраў, злётаў. Усё гэта пашырае добраахвотніцкі рух. Сёлета колькасць «сярэбраных» валанцёраў у параўнанні з 2021 годам узрасла амаль на 40 %.

Стаць «сярэбраным» валанцёрам у нашай краіне можа кожны.

— Дастаткова звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання ў сваім раёне, і вам падкажуць кірункі, па якіх можна ўдзельнічаць у розных праектах. Што датычыцца дапамогі адзінокім, то тут мы аддаём перавагу грамадскім арганізацыям, бо мусім быць упэўненыя ў тых людзях, якія ідуць у дом да адзінокага пажылога чалавека, — тлумачыць Вольга Дубовік.

У Беларускай праваслаўнай царкве можна звяртацца ў аддзел па царкоўнай дабрачыннасці і сацыяльным служэнні, які прымае добраахвотнікаў. Знайсці справу па душы можна ў брацтвах і прыходах, а пра ініцыятывы даведацца на сайце Беларускай праваслаўнай царквы. Ці проста патэлефанаваць па нумары сацыяльнага аддзела, расказаць пра ўласную ініцыятыву, агучыць свае пажаданні і ўключыцца ў тыя ініцыятывы, якія ўжо існуюць.

Усе рэкамендацыі, як стаць валанцёрам Чырвонага Крыжа, ёсць на сайце арганізацыі. Там жа можна запоўніць анкету са сваімі дадзенымі, пасля чаго з вамі звяжацца спецыяліст.

Памятайце, што стаць валанцёрам ніколі не позна. Звярніцеся ў згаданыя арганізацыі ці аб'ядненні, прайдзіце курсы. І ўбачыце, як з'яўляюцца магчымасці, якія раней вы лічылі нерэальнымі.

Алена КРАВЕЦ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«ПАЦЕРКІ ПАВЕСІЛІ, СТАЛІ Ў КАРАГОД...»

СТАНДАРТНЫЯ ВАРЫЯНТЫ

Аграэкасядзіба (а таксама турбаза або база адпачынку). На сённяшні дзень аграсядзіб у краіне больш за тры тысячы, распавяла **намеснік дырэктара Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Кацярына НІКІЦІНА**. Многія з іх распрацавалі яркія і незвычайныя анімацыйныя праграмы на навагоднюю ноч. Але амаль усе яны ўжо забраніраваны. Каштаваць задавальненне будзе ў сярэднім пачынаючы ад 150 рублёў за суткі.

— Што датычыцца баз адпачынку, у Беларусі яны самыя разнастайныя, але з імі ёсць нюанс: многія абсталяваны толькі на летні час. Так што на Новы год я раіла бы разглядаць праграмы ў санаторыях і ў гасцінічных комплексах, — заўважае Кацярына Нікіціна. — Іншая справа, што і з санаторыямі тыя, хто спахапіўся толькі ў пачатку снежня, хутчэй за ўсё, ужо спазніліся.

Але вернемся да Новага года ў аграсядзібах.

Плюсы такога выбару. Гэта як незабыўныя студэнцкія навагоднія вечарынкі на лецішчы ў сяброў, толькі лепш. Не трэба ламаць сабе галаву, чым пацешыць і — бонус для жанчын — чым накарміць сям'ю і гасцей. За вас усё зробяць гаспадары: і стол накрыюць, і печку зацепляць, і лазенку прыгатуюць, і забавы прапануюць.

Мінусы. Абсалютная большасць аграсядзіб, асабліва паблізу ад сталіцы і абласных цэнтраў, ужо забраніравана аж да канца студзеня. Ідэя ляжыць на паверхні, а значыць, прыходзіць у галаву ўсім і кожнаму. Дарэчы, калі вы вырашылі адзначыць Новы год, выдаткаваўшы мінімум грошай, гэты выбар, вядома, можа здацца надта затратным.

Санаторый. Яшчэ адзін варыянт, для рэалізацыі якога ўжо позна (ну, ці амаль позна). Санаторыяў у Беларусі 105 (уключаючы прафсаюзныя і дзіцячыя), і на сённяшні дзень іх загрузка складае больш за 75 %.

— Як правіла, Новы год у санаторыі прадугледжвае банкет, анімацыйную праграму, а таксама выезд на нейкую славутасць у непасрэднай блізкасці да санаторыя, — распавядае Кацярына Нікіціна. — Урачыстасці ў навагоднюю ноч прадугледжаныя і ў рамках вялікай праграмы — сямі- або чатырнаццацідзённай, і ў многіх санаторыях — у рамках экспрэс-пуцёўкі выхаднога дня (калі госці прыязджаюць на два дні). Але трапіць у санаторый на навагоднюю ноч ужо ў пачатку снежня было праблематычна. Нават цяпер, не ў пікавыя даты, загрузка санаторыяў перавышае 75 %, а пад Новы год мы прагназуем вяртанне да летніх паказчыкаў — 90 %.

Быццам бы застаецца люфт 10 %. Але тут — ізноў жа — ёсць нюанс. Як правіла, у топавых санаторыях гэтыя 10 % прынята пакідаць свабоднымі, каб не было натоўпаў людзей на працэдуры, чэргаў у аквазоне і абедзенай зале.

Плюсы. Санаторная пуцёўка на Новы год — гэта магчымасць паплаваць у басейне, прайсці шэраг аздараўленчых, а таксама бьюці-працэдур (што таксама вельмі карысна). Пачаць год з прыгажосці і здароўя — чаму б і не? Для шумных кампаній гэты варыянт не падыдзе, а вось для людзей сярэдняга ўзросту, асабліва калі гэты Новы год па нейкай прычыне ім прыйдзецца сустракаць у адзіноце, — тое, што трэба. Вы будзеце сярод людзей, бо глядзець у тэлевізар, лежачы на канапе, — сцэнарый так сабе. Плюс — зможаце стаць здаравейшымі, маладзейшымі і прыгажэйшымі, то-бок сумесціце карыснае з прыемным.

Мінусы. Варыянтаў ужо практычна няма: трэба было думаць загадзя.

— Я раіла б у наступным годзе паклапаціцца аб сустрэчы Новага года ў санаторыі або аграэкасядзібе мінімум за два месяцы да пачатку снежня, — кажа Кацярына Нікіціна. — Менавіта ў гэты час вялікі выбар, яшчэ не распрададзеныя самыя цікавыя прапановы. А сёння я рэкамендавала б пачаць планаваць майскія выхадныя ў санаторыі.

Яшчэ адзін мінус Новага года ў санаторыі — частаваць і забаўляць будуць у дакладнай адпаведнасці з раскладам. Спантаннасці тут месца няма. І, вядома, ёсць яшчэ матэрыяльны бок пытання: прыкладны кошт дня ў санаторыі — ад 100 рублёў (гэта з харчаваннем, працэдурамі і аквазонай), а ў рамках экспрэс-праграмы выхаднога дня — ад 150—220 рублёў.

Новы год у горадзе. Калі мітусіцца не хочацца, рэзкія рухі не выклікаюць энтузіязму, а душа ўсё ж просіць свята — у навагоднюю ноч можна проста адправіцца на шпацыр. Каля галоўнай ёлкі ў кожным населеным пункце будзе нейкі рух. Чаму б да яго не далучыцца? Фуд-зона і канцэрт, а таксама рознага роду івэнты з удзелам Дзеда Мароза і Снягуркі гарантаваныя, нейкія гледачы таксама будуць. У Мінску, напрыклад, з 25 снежня па 7 студзеня запланавана аж 250 розных святочных мерапрыемстваў. Асноўнымі пунктамі стануць пляцоўкі каля Палаца спорту, Верхні горад і Ракаўскае прадмесце. Як адзначаюць ва ўпраўленні культуры Мінгарвыканкама, навагоднія мерапрыемствы з удзелам Дзеда Мароза і Снягуркі ў беларускай сталіцы будуць праходзіць з 12 снежня па 15 студзеня. Напрыклад, непасрэдна ў святочную ноч каля Палаца спорту адбудзецца танцавальнае шоу «Новы год для ўсіх». З 00.30 да 04.00 тут будуць працаваць дыджэі і спяваць папулярныя артысты.

Не варта забываць і аб навагодніх кірмашах, якія будуць у тым ліку працаваць у навагоднюю ноч. У сталіцы гандлёвыя рады разгорнуцца каля Палаца спорту, на Кастрычніцкай плошчы і — новая лакацыя — у Ракаўскім прадмесці. А калі ехаць у цэнтр неахвота, можна пагуляць і бліжэй — святочныя мерапрыемствы запланаваны ў навагоднюю ноч у кожным раёне сталіцы.

Фота maglev.by

Плюсы. Найменш затратны варыянт — і з пункту гледжання прыкладзеных намаганняў, і з пункту гледжання матэрыяльнага.

Мінусы. Банальна холадна. У навагоднюю ноч сіноптыкі абяцаюць -13—16 °С — не лепшая тэмпература для прагулак. Хоць, як гавораць палярнікі, не бывае дрэннага надвор'я, бывае непадыходнае адзенне. Улічыце: сагрэцца ў рэстаранах па маршруце наўрад ці атрымаецца — столікі на навагоднюю ноч у іх, хутчэй за ўсё, забраніраваны загадзя. Але, магчыма, у барах і кафэ знойдзецца месцейка і для вас. Хоць такія (дзе знойдзецца месцейка) прыйдзецца пашукаць.

НЕСТАНДАРТНЫЯ ВАРЫЯНТЫ

Нацыянальны парк. Калі ў вас дэфіцыт навагоднягa настрою, папоўніць яго запас можна ў рэзідэнцыі Дзеда Мароза.

— У Белавежскай пушчы сёлета цікавыя навагоднія праграмы, — адзначае Кацярына Нікіціна. — Там з'явіўся новы аб'ект — археалагічны музей, і на яго арыентаваны шэраг івэнтаў. Акрамя таго, там цяпер актыўна развіваюць турыстычныя маршруты з выкарыстаннем розных відаў транспарту — фэтбайкі з патоўшчанымі коламі (яны падыходзяць нават для зімовага перамяшчэння), электратранспарт.

Зразумела, наўрад ці нумары ў гасцініцах парку да апошняй дэкады снежня засталіся незабраніраванымі. Але можна прыехаць проста на экскурсію, тым больш што Белавежская пушча месціцца зручней за іншыя нацыянальныя паркі: паблізу ад абласнога цэнтра. Можна засяліцца ў гасцініцу ў Брэсце — там шмат варыянтаў рознага ўзроўню і цэнавых катэгорый.

— А ў цэлым сёлета ў кожным нацыянальным парку Беларусі падрыхтавана свая навагодняя праграма, — распавяла намеснік дырэктара дэпартамента па турызме.

Напрыклад, у Прыпяцкім парку усіх ахвотных запрашаюць у госці да Палескага Зюзі ў навагодні «Сафары-парк». Пачастункі ад Бабы Ягі — бясплатна. Бонус — магчымасць пагладзіць ручных аленяў. А ў Бярэзінскім запаведніку спецыяльна для тых, хто нічога не планаваў загадзя, але свята ўсё ж такі захацеў, распрацавана аднадзённая праграма «Навагодняя казка ў Бярэзінскім» (там вас чакаюць прыязны да турыстаў зубр Валера, а таксама мядзведзіцы Умка і Васіліса).

Гарналыжны цэнтр. Чаму б не правесці навагоднюю ноч у стылі галівудскіх зорак: пакатацца на горных лыжах або снаўбордзе? З аднаго боку, яднанне з прыродай і забавы ў стылі ЗЛЖ, з другога — багаты навагодні стол, рознага роду святочныя гульні і конкурсы. Гарналыжны цэнтр — ідэальны варыянт для вясёлага Новага года. І такая ідэя прыйшла ў галаву многім: у Сілічах, напрыклад, ужо напачатку снежня ўсе месцы на навагоднюю ноч былі распрададзеныя, нягледзячы на кошт (1120 рублёў за самую кароткую — 4 ночы — навагоднюю пуцёўку). Можна паспрабаваць шчасця, патэлефанаваўшы ў спартыўныя комплексы «Раўбічы» і «Лагойск». Але, амаль дакладна, месцаў ужо не будзе і там. Так што гэта варыянт на будучы год.

У мінулыя гады весела і незвычайна адсвяткаваць навагоднюю ноч можна было ***ў аквапарку***. Сёлета «Лебядзіны», дзе праводзіліся самыя «інстаграмныя» навагоднія вечарыны, у ноч з 31 снежня да 1 студзеня працаваць не будзе: тут распавялі, што 31 снежня аквапарк працуе да 20.00, а 1 студзеня — з 12.00.

Старажытны замак. Новы год у замку — гэта, вядома, надзвычайны (хоць і таксама нятанны) варыянт, але ў Нясвіжы (атэль «Палац») свабодных месцаў на святкаванне навагодняй ночы ўжо няма. А вось у Мірскім замку яшчэ ёсць — можна паспець забраніраваць апошнія. Тым больш што кошт па мерках дарагоўлі навагодняй ночы цалкам адэкватны: 420 рублёў з пражываннем, банкетам і забаўляльнай праграмай. Калі на навагоднюю ноч у Нясвіжскім замку разлічваць ужо не даводзіцца, то можна пабываць там на канцэртах: фестываль «Каляды ў Нясвіжы» стартуе 24 снежня. Гэта цудоўныя канцэрты класічнай музыкі, казачная атмасфера старажытнага замка і адчуванне навагоднягa чараўніцтва. Акрамя таго, і ў Нясвіж, і ў Мір можна трапіць на праваслаўнае Раство: 5 студзеня ў Нясвіжскім замку будзе гучаць калядны джаз у выкананні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Фінберга — і гэта выдатны шанц пачаць год з прыгожага культурнага мерапрыемства. А 7 студзеня ў Міры адбудзецца Дзіцячы калядны баль: юныя дамы і кавалеры змогуць атрымаць урок прыдворнага этыкету і паспрабаваць сябе ў старадаўніх танцах.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сувязі

Мемарандум дружбы падпісалі ва Узбекістане

У Саюзе пісьменнікаў Узбекістана падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж пісьменніцкімі арганізацыямі Беларусі і Узбекістана

У рамках дакумента адлюстраваны памкненні творчых арганізацый, літаратараў абедзвюх краін да цеснага супрацоўніцтва. Каментуючы падзею, старшыня Саюза пісьменнікаў Узбекістана, паэт Сіражыдзін Саід адзначыў, што ў развіцця беларуска-ўзбекскіх літаратурных сувязяў ёсць моцны грунт. З Ташкентам, Узбекістанам звязаны імёны многіх беларускіх паэтаў і празаікаў: народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, Сцяпана Ліхадзіеўскага, Аркадзя Мардвілкі, Эдзі Агняцвет і іншых. Гэта помняць, пра гэта ведаюць ва Узбекістане. У Беларусі неаднойчы пабывалі пісьменнікі Узбекістана Зульфія, Сіражыдзін Саід, Мінхажыдзін Мірзо, Рысалат Хайдарава, Кучкар Наркабіл і іншыя вядомыя майстры слова.

У час дыялогу ў ташкенцкай штаб-кватэры пісьменнікаў старшыня СП Беларусі Алесь Карлюкевіч адзначыў як стратэгічную мэту правядзенне тыдня альбо дзён узбекскай літаратуры ў Беларусі. Дарэчы, на XXX Мінскую міжнародную выстаўку-кірмаш Узбекістан запрошаны як краіна — цэнтральны экспанент выстаўкі. Значыць, ужо цяпер трэба думаць пра новыя творчыя праекты, пра тое, што заўтра пяднае нашых перакладчыкаў, публіцыстаў, паэтаў і празаікаў. Удзел у размове ў СП Узбекістана ўзяў і дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук Іван Саверчанка.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Надвор'е

Снег, мяцеліца, галалёдзіца, а ноччу яшчэ і мароз

Раніцай у панядзелак сталіцу падморозіць да мінус 19 і больш

Кругаварот нейкі, не інакш. Спачатку з паўднёва-заходнімі патокамі ў нашу краіну працягнуць паступаць атмасферныя франты, якія прынясуць ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу. Гэта ў пятніцу і суботу. А пасля яны спыняцца, затое будзе холадна, асабліва ўначы. У сераду зноў мокры снег з дажджом, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У суботу, 17 снежня, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе снег, слабая завея. У паўднёва-ўсходніх раёнах ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, слабы галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад мінус 4 да мінус 11 градусаў. Днём тэмпература паветра складзе мінус 2—8 градусаў. Па паўднёвым усходзе краіны ўначы прагназуецца ад 0 да мінус 3 градусаў, а ўдзень ад мінус 1 да плюс 1.

У нядзелю і панядзелак будзе назірацца рост атмасфернага ціску, а значыць, ападкаў стане менш. Паводле папярэдняга прагнозу, да сярэдзіны наступнага тыдня ў краіну пачне паступаць больш цёплае атлантычнае паветра, ападкі са снегу будуць пераходзіць у мокры снег і дождж, што прывядзе да ўтварэння галалёду.

У нядзелю пераважна па паўднёва-ўсходняй частцы краіны пройдзе снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 8—15 градусаў, пры праясненнях да 18 марозу. На паўднёвым усходзе тэмпература будзе ў межах мінус 5—7 градусаў, а днём — 5—12 марозу.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, панядзелак чакаецца без ападкаў. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу складзе мінус 10—17 градусаў, месцамі — мінус 18—20. Днём чакаецца мінус 6—13 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

У ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА КІНО ГЛЯДЗІЦЕ НАЙЛЕПШАЕ

Як вядома, 17 снежня 1924 года была заснавана кінастудыя «Белдзяржкіно». З таго моманту пачалася работа над першымі айчыннымі дакументальнымі, а пасля і ігравымі стужкамі. Менавіта ў гэты дзень краіна адзначае Дзень беларускага кіно. З нагоды прафесійнага свята кінематаграфістаў тэлеканал «Беларусь 3» падрыхтаваў тэматычны эфір.

Дзень беларускага кіно на тэлеканале адзначыцца адразу некалькімі прэм'ерамі. У 14:20 упершыню на тэлебачанні пакажуць тры анімацыйныя стужкі, створаныя Нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм» у 2022 годзе, — «Сон у зімовую ноч» (рэжысёр Алена Пяткевіч), «Класікі і шахматы» (рэжысёр Наталля Касцючэнка), «Прэлюдыя і фуга» (рэжысёр Ігар Волчак). У 19:35 адбудзецца прэм'ера дакументальнага фільма «У кадры і за кадрам. Кінааператар Анатоль Забалоцкі», над якім працаваў прадзюсар і рэжысёр Сяргей Кацьер у суаўтарстве з рэжысёрам Юрыем Цімафеевым.

— Наш фільм пра легенду савецкага кінематографа. Анатоль Дзмітрыевіч — таленавіты кінааператар, выдатны фотамастак, цікавы пісьменнік і чалавек са складаным лёсам, са складанымі адносінамі з мастацтвам. Ён працаваў над стужкамі, якія сталі класікай: «Каліна чырвоная», «Печкі-лавачкі», «Альпійская балада», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» і шэрагам іншых, — адзначае Сяргей Кацьер. — Анатоль Дзмітрыевіч валодае моцным характарам. І не кожнаму ён пойдзе насустрач, адкрые сэрца, душу. Ведаеце, як у нас кажуць: аператар — не аратар. Яны ўвогуле не любяць размаўляць, аператары збольшага маўклівыя. Але нам удалося паразумецца. Таму фільм атрымаўся глыбокі.

У гэты ж дзень у эфіры «Беларусь 3» — дакументальныя тэлефільмы Сяргея Кацьера «Майстар. Рэжысёр Віктар Тураў» і «Санеты памяці. Кінааператар Таццяна Логінава». Таксама 17 снежня на сацыякультурным тэлеканале будзе магчымасць убачыць найлепшыя ўзоры беларускага ігравога кіно розных жанраў: «Прыгоды Бураціна», «Белыя росы», «Вянок санетаў», «Альпійская балада» і «Сведкі».

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 161

Сваю новую задачу даслаў нам Сяргей Дарошчанка (гл. дыяграму).

Белыя: Крg8, Фh3, Лb1, Са5, Се2, Кe4, пd5 (7).

Чорныя: Крe8, Лb8, Сf8, Кb7, Кh7, пп. с5, d7, e7, f6, f7 (10).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Міхаіл Нікіценка выйграў турнір у Калкаце (Індыя; 37 удзельнікаў) — ён перамог у васьмі партыях, адну завяршыў унічыю. Аляксей Аляксандраў фінішаваў восьмы ў Хіве (Узбекістан; 34 гульцы).

Фінішавала першынство Беларусі сярод інвалідаў з парушэннямі апорна-рухальнага апарату, дзе змагаліся 16 гульцоў ва ўзросце ад 9 да 83 гадоў. Дзясяты раз чэмпіёнам краіны стаў Яўген Койшман, на другім месцы — 11-гадовы Міхаіл Дзеніseня, на трэцім — Віктар Янкоўскі.

Навіны завочных шахмат. Каманда Беларусі заняла трэцяе месца ў паўфінале 22-й Алімпіяды — 25,5 бала з 48. Турнір першай лігі 16-га чэмпіянату Беларусі выйграў Уладзімір Мацукевіч з Брэста — 12 балаў з 14.

* * *

У Мінску праходзілі турніры першай лігі чэмпіянату Беларусі. Пра іх вынікі мы яшчэ распавядзём, а пакуль прапануем некалькі партый.

Міхаіл Яшчук — Арцём Сіняўскі. 1. e4 e6 2. d4 d5 3. Kd2 c5 4. ed Ф:d5 5. Kgf3 cd 6. Cc4 Фd8 7. Kb3 Kc6 8. Kb:d4 K:d4 9. K:d4 a6 10. 0-0 Cd6 11. h3 Ke7 12. Лe1 0-0 13. Kf3 Kg6 14. Kg5 h6 15. Ke4 Ce5 16. Фh5 Фa5 17. Крf1 Фc7 18. Cd3 Cd7 19. Фg4 Лfd8 20. a4 Ce8 21. Фe2 Kf4 22. C:f4 C:f4 23. Kc3 Лd4 24. g3 Cg5 25. Лad1 Лad8 26. Ke4 Ce7 27. c3 Л:a4 28. f4 Лa5 29. Kf2 Cc6 30. b4 Лad5 31. Фe3 Cf6 32. c4 Л5d7 33. Ce2 Cd4 34. Фb3 Фb6 35. Kd3 Ce4 36. b5 a5 37. c5 C:c5 38. Фc4 Cd4 39. Ke5 Лc7 40. Фb3 Cc2 41. Фf3 C:d1 42. Л:d1 Лc3 43. Kd3 a4 44. Фe4 a3 45. Kb4 Л:g3, 0:1.

Ігар Люцко — Ксенія Норман. 1. d4 g6 2. Kf3 Cg7 3. e4 d6 4. Cc4 e6 5. Cg5 Ke7 6. Cb3 h6 7. Cf4 0-0 8. h4 c5 9. dc dc 10. Kbd2 b5 11. c3 Cb7 12. Фe2 c4 13. Cc2 Kd7 14. Cd6 e5 15. h5 g5 16. Kf1 Лe8 17. Лd1 Kc6 18. Ke3 Фa5 19. a3 Kf6 20. Лd2 Лad8 21. 0-0 K:h5 22. g3 Kf6 23. Лfd1 Фb6 24. a4 a6 25. ab ab 26. b3 cb 27. Cb1 Ka5 28. Cb4 K:e4 29. Л:d8 Л:d8 30. Л:d8+ Ф:d8 31. Kf5 g4 32. Ke7+ Kph8 33. C:e4 gf 34. Ф:f3 b2 35. Фe2 C:e4 36. Ф:e4 Kc4, 0:1.

Ігар Расіхін — Вячаслаў Зарубіцкі. 1. e4 c5 2. Kc3 Kc6 3. f4 g6 4. Kf3 Cg7 5. Cb5 Kd4 6. 0-0 a6 7. Cc4 b5 8. Cd5 Лb8 9. d3 e6 10. Cb3 Ke7 11. K:d4 cd 12. Ke2 0-0 13. Фe1 f5 14. e5 Kc6 15. c3 dc 16. bc d6 17. d4 d5 18. Ca3 Лf7 19. Cd6 Лbb7 20. Kc1 Ka5 21. Kd3 Kc4 22. C:c4 dc 23. Kc5 Лb6 24. a4 b4 25. cb Л:d6 26. ed C:d4+ 27. Крh1 C:a1 28. Ф:a1 Ф:d6 29. Лd1 Ф:f4 30. Лd8+ Лf8 31. Л:f8+ Кр:f8 32. Фh8+ Крe7 33. h3 Фc7 34. Ф:h7+ Крd6 35. Ф:g6 a5 36. Фg3+ e5 37. Фg6+ Крd5 38. Фg8+ Крd4 39. Ke6+ C:e6 40. Ф:e6 c3, 0:1.

* * *

Удакладнім дэбют партыі Ігар Люцко — Платон Клачкоў з мінулага выпуску: 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kc3 Cg7 4. e4 d6 5. h3 0-0 6. Cg5 c5 7. d5 e6 8. Cd3 ed 9. cd Лe8 10. Kge2 Kbd7 11. 0-0 a6 12. Лc1 b5 і г. д.

* * *

Убачыла свет кніга «Дзмітрый Жылко: жыццё, творчасць, шахматы» пра шахматнага складальніка, які сёлета, на жаль, пайшоў з жыцця. У кнізе сабрания 114 шахматных і шашачных кампазіцый аўтара.

* * *

